Слова для Жыцця (38)

Аўтар: Рэдакцыя
30.11.2012 01:00



Папа Бэнэдыкт XVI

Прытым ясна, што гэтае Валадарства заснавана на адносінах з Богам, з праўдай, і не з'яўляецца палітычным Валадарствам. Езус адкрыў нам шлях да глыбокіх адносін з Богам. Быць вучнем Езуса азначае супрацьстаяць спакусам часовай логікі ўлады і замест таго несці ў свет святло Божай праўды і любові. Умовай стварэння Валадарства Хрыста з'яўляецца наша навяртанне, як адказ на Божую ласку. Гэта моцны заклік, адрасаваны ўсім і кожнаму, – "стала навяртацца да Божага Валадарства, да Божага панавання, Ісціны ў нашым жыцці".

Паводле беларускай секцыі Radio Vaticano, 25.11.2012 †



Кс. абп Тадэвуш Кандрусевіч

Сёння, калі мы маем свабоду веравызнання і адначасова калі секулярныя і ліберальныя тэндэнцыі нішчаць веру, неабходна быць моцнымі ёю, каб бараніць яе і прыкладам свайго жыцця абвяшчаць.

Фрагмент гамілii, паводле Catholic.by, 25.11.2012

Слова для Жыцця (38)

Аўтар: Рэдакцыя
30.11.2012 01:00

